# Беларускі універсітэт

**Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна**

№ 19 (261) | 11 чэрвеня 1956 года | Цана 20 кап.




На гэтым здымку выпускніцы Святлана Ігнацьева і Антаніна Рыбарэва. Апошнія дні заняткау у сценах БДУ, апошнія наведванні лабараторый, музеяу. Пройдзе яшчэ некалькі тydняу, закончацца дзяржауныя экзамены і спецыялісты-геолагі раз'едуцца у розныя куткі нашай Радзімы, дзе іх чакае цікавая, захапляючая работа.

Фото М. МІНКОВІЧА.

# СПРАВАЗДАЧА ПЕРАД РАДЗІМАЙ

Хутка канец навучальнага года. І зноу са сцен універсітэта выйдзе яшчэ адзін атрад маладых спецыялістау. Будучых філолагау, хімікау, біёлагау, матэматыкау, юрыстау чакае нялёгкая, але ганаровая праца на карысць любімай Радзімы.

Студэнт-выпускнік... Пры гэтых словах перад вачыма узнікае не толькі вобраз юнака або дзяучыны з універсітэцкім значком на грудзях, а вобраз чалавека, які цалкам і на усё жыццё прысвяціу сябе выбранай ім працы, які за гады вучобы зрабіу усё магчымае, каб апраудаць тыя надзеі, што ускладзены на яго дзяржавай, і, нарэшце, чалавека, які цяпер стаіць на парозе зусім новага для яго жыцця—на парозе самастойнай працы.

Гарачая пара зараз у выпускнікоу. Абаронены дыпломныя работы, вядома, куды поїдзе кожны з іх працаваць, але уперадзе яшчэ дзяржауныя экзамены. У выпускнікоу хімфака яны ужо пачаліся. 5 чэрвеня пяцікурснікі здавалі экзамен па асновах марксізма-ленінізма.

...У аудыторыі, дзе праходзіць экзамен, стаіць напружаная цішыня. Студэнты абдумваюць свае білеты. Першай гатова да адказу О. Ясінская. Яна падрабязна і удумліва расказвае аб развіцці рэвалюцыйнага руху у Расіі, аб узнікненні першых палітычных арганізацый рабочага класа, аб росце палітычнай свядомасці мас. Бачна, што студэнтка глыбока ведае гэта пытанне. Таксама добра адказвае яна і на астатнія два пытанні білета, і экзаменацыйная камісія ацэньвае яе адказ на «выдатна». За Ясінскай адказвае Л. Неакладнава. Ёй трэба расказаць аб плеханаускай групе «Освобождение труда», аб разгроме трох паходау Антанты і аб праблеме мірнага суіснавання соцыялістычнай і капіталістычнай сістэм. Па усіх трох пытаннях студэнтка паказала выдатныя веды. К. Майсейчук правільна і глыбока разбіраецца у пытанні аб марксісцкім філасофскім матэрыялізме. Яго адказ таксама заслугоувае выдатнай ацэнкі.

Парадавалі сваімі адказамі М. Някрасава, Ю. Цярэнц'ева і іншыя. Агульны малюнак нямнога сапсавала Л. Давідоуская. Адказ яе быу вельмі слабым і хаця быу ацэнен на «здавальняюча», экзаменацыйная камісія, па словах яе старшыні т. Бардышэва, хісталася, паставіць «здавальняюча» ці «нездавальняюча». Значна лепш маглі-б адказаць Е. Ермалаева і А. Ахрамовіч.

Экзамінатар Г. В. Івашын, дзелячыся сваімі заувагамі аб прайшоушым экзамене, сказау, што у цэлым група робіць даволі добрае уражанне. Многа студэнтау паказалі глыбокія веды. Гэта сведчыць аб тым, яшо яны сур'ёзна і добрасумленна аднесліся да экзамену.

Адзін экзамен закончан, уперадзе—экзамен па спецкурсу. А там—цікавая, захапляючая работа.

**А. СТАНЮТА.**

## *Пасяджэнне Вучонага совета*

5 чэрвеня адбылося пасяджэнне Вучонага совета БДУ. На пасяджэнні быу заслуханы і абмеркаваны даклад рэктара універсітэта прафесара К. І. Лукашова аб падрыхтоуцы да новага навучальнага года.

У гэтым годзе універсітэт выпускае 774 спецыяліста для народнай гаспадаркі і школ рэспублікі. З іх 399 займаліся на стацыянары, а 375—завочна. Выпускнікі у асноунай сваёй масе добра падрыхтаваны і здольны вырашаць складаныя пытанні практыкі. Радасным з'уляецца тое, што з боку школ і прадпрыемствау ёсць вялікі попыт на спецыялістау, якіх выпускае універсітэт. Асабліва вялікі ён на фізікау і матэматыкау.

Далей К. І. Лукашоу гаварыу, што побач з адзначанымі поспехамі у вучэбна-выхавауччай рабоце ёсць і буйныя недахопы. Усё яшчэ ёсць выпадкі парушэння дысцыпліны з боку студэнтау. Вельмі многа прапускаецца лекцый без уважлівых прычын. Некалькі чалавек было выключана з універсітэта за амаральныя паводзіны. Былі выпадкі, калі грамадскія мерапрыемствы (паходы у кіно, тэатр і г. д.) праводзіліся у час заняткау На нізкім узроуні вядзецца выхавауччая работа.

Дакладчык таксама указау на задачы, якія стаяць перад прафесарска - выкладчыцкім складам у новым навучальным годзе. Асноунымі задачамі з'уляюцца рацыяналізацыя вучэбнага працэсу, наблiжэнне усёй вучэбнай, выхаваучай і навукова-даследчай работы кафедр да патрэб практыкі, да народнай гаспадаркі і прамысловасці.

Члены Вучонага совета, выступаючы у спрэчках па дакладу, асноуную сваю увагу звярталі на пытанні навукова-даследчай работы. Выступаушыя гаварылі, што навукова-даследчая работа вядзецца дрэнна, адарвана ад патрэб народнай гаспадаркі. Студэнтамі і выкладчыкамі часта распрацоуваюцца тэмы, якія не маюць практычнага значэння. Вялікім тормазам у навуковай рабоце з'уляецца недастатковая колькасць лабараторый, прыборау і г. д. Студэнты не маюць нярэдка часу для навукова-даследчай работы з-за перагружанасці акадэмічнымі заняткамі. У будучым годзе намячаецца ліквідаваць усе гэтыя недахопы.

У пастанове, прынятай Вучоным советам, гаворыцца, што пры падрыхтоуцы да новага навучальнага года неабходна сканцэнтраваць увагу на практычным ажыццяуленні пастауленых XX з'ездам КПСС задач у справе усямернага паляпшэння якасці падрыхтоукі спецыялістау для народнай гаспадаркі і навукова-педагагічных кадрау, на карэнным паляпшэнні навукова-даследчай работы. У мэтах выканання гэтых задач пастанова прадугледжвае рад канкрэтных мерапрыемствау.

# ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

★ ★ ★

## ЗДАЮЦЬ ПЕРШАКУРСНІКІ

На І курсе хімфака ідзе экзамен па асновах марксізма-ленінізма. Студэнты здаюць толькі на «добра» і «выдатна». Гэта і зразумела.

— Мы правялі перад сесіяй курсавы комсамольскі сход,—гаворыць комсорг курса В. Якаулевіч.—На сходзе абмяркоуваліся пытанні, звязаныя з падрыхтоукай да сесіі. Усе комсамольцы выказалі аднадушнае жаданне дапамагчы Рабцаву і Грышчуку, якія адставалі у вучобе.

Першы дзень экзаменау паказау, што студэнты старанна падрыхтаваліся. Толькі адзін чалавек з усяго курса не дапушчан да сесіі. Гэта Г. Ільын, які не здау залік па англійскай мове. Яшчэ у мінулую сесію ён атрымау «здавальняюча».

— Мы з Ільыным гаварылі,—тлумачыць групорг Г. Браніцкі,—ды ён не зрабіу для сябе належных вывадау, працавау па-ранейшаму мала. У выніку ён не дапушчан да экзаменау. У нас ёсць і такія таварышы, якія не адмауляюцца ад дапамогі, старанна рыхтуюцца да экзаменау. Берднікаву, напрыклад, дапамагау Е. Самускевіч, таму ён выдатна справіўся з курсавой работай і паспяхова здау экзамен па асновах марксізма-ленінізма.

У асноуным усе студэнты курса да сесіі падрыхтаваліся добра, а такія, як Е. Самускевіч, К. Сінякова і іншыя, здаюць толькі на «выдатна».

**Б. ФРАЛОЎ.**

## КОРАТКА

27 мая група студэнтау IV курса аддз. фізікі, якая спецыялізавалася па оптыцы, здавала экзамен па спектраскапіі атамау і малекул.

Ад студэнтау патрабавалася самастойнае вырашэнне многіх складаных пытанняу. Пры адказах высветлілася выдатная падрыхтоука групы да гэтага цяжкага экзамену: 12 чалавек здалі на «выдатна», астатнія—на «добра». Парадавалі добрымі адказамі студэнты В. Грыневіч, А. Шэлег, М. Крывашэева, І. Зяцькоу і іншыя.

**О. ЗАПОЛЬСКІ.**

* * *

5 чэрвеня здалі экзамен па палітэканоміі соцыялізма студэнты IV курса аддз. рускай мовы і літаратуры. 19 «выдатна» і 27 «добра»—такі вынік экзамену.

* * *

Здалі летнюю экзаменацыйную сесію першакурснікі аддз. біялогіі. Асноуная большасць студэнтау добрасумленна падрыхтавалася да экзамену па асновах марксізма-ленінізма і атрымала добрыя і выдатныя адзнакі. Сярод іх трэба адзначыць І. Рачкоускую, Т. Карабанаву, Т. Лебедзеву, Л. Байкову. Аднак не усе студэнты сур'ёзна падрыхтаваліся да свайго першага экзамену. Аб гэтым сведчыць пяць здавальняючых адзнак.

Як і у зімовую экзаменацыйную сесію, дрэнныя веды паказалі студэнткі І. Казакевіч, Э. Карбановіч, Р. Красоуская.

«Здавальняючыя» адзнакі па асновах марксізма-ленінізма атрымалі таксама Р. Тарлецкая і Л. Капітонава.

## Экзамен па педагогіцы на III курсе філфака

Курс педагогікі чытауся на працягу другога семестра гэтага года. Студэнты добра наведвалі, уважліва слухалі лекцыі. Амаль усе яны вялі канспекты, чыталі рэкамендаваную літаратуру. Усё гэта садзейнічала іх паспяховай падрыхтоуцы да экзамену. Большасць студэнтау трэцякурснікау паказалі глыбокае веданне курса педагогікі. Яны маюць дастатковае уяуленне таксама і у практычных пытаннях жыцця школы: пабудове урока, прынцыпах і метадах навучання, змесце і метадах маральнага выхавання. Вельмі змястоунымі і глыбокімі былі адказы Зімака, Рожына, Шульгі, Нячай і многіх іншых.

Агульны вынік экзамену характарызуецца толькі добрымі і выдатнымі ацэнкамі.

**Дацэнт Л. ШАШКОЎ.**

## Першы поспех

На першым паверху ля дзвярэй адной з аудыторый сабраліся другакурснікі гістфака. Перагортваюцца старонкі кніг, канспектау... Апошнія мінуты перад экзаменам.

Кожная сесія—вялікая падзея у жыцці студэнта. Яна падводзіць вынікі яго работы на працягу усяго навучальнага года. Ужо у ходзе семінарскіх заняткау большасць студэнтау праявіла цікавасць да вывучэння асноу марксізма-ленінізма. Заусёды добра рыхтаваліся і актыуна выступалі на семінарскіх занятках Міхаіл Рэзнік, Ліля Маліноуская, Эльза Маковіч, Уладзімір Конан. Іх адказы былі змястоунымі і цікавымі. Сур'ёзныя адносіны да заняткау, канспектаванне лекцый, вывучэнне першакрыніц аказалі вялікую дапамогу гэтым студэнтам пры падрыхтоуцы да экзамену па асновах марксізма-ленінізма.

У аудыторыю уваходзіць невысокая, сціпла апранутая дзяучына. Гэта Ліля Маліноуская. Узяушы білет, яна спакойна абдумвае кожнае пытанне. Адказ яе чоткі і змястоуны. Студэнтка падрабязна расказвае аб рабоце XVIII з'езду партыі, аб яго рашэннях і гістарычным значэнні. Экзамінатар В. І. Мацко задаволены асвятленнем першага пытання і прапаноувае Лілі перайсці да другога. Па пытанню аб пераходным перыядзе ад соцыялізма да комунізма яна паказала глыбокае веданне і разуменне матэрыялу. Добры і змястоуны адказ Лілі Маліноускай заслужана ацэнен «выдатна».

Адзін за другім выходзяць расчырванеушыя і усхваляваныя другакурснікі. У іх заліковых кніжках толькі выдатныя і добрыя адзнакі.

Экзамен набліжаецца да канца. Студэнты не разыходзяцца, яны хвалююцца за кожнага свайго таварыша.

Нарэшце, выходзіць апошні. Адразу-ж яго акружаюць таварышы.

— Як здау? Што?—пасыпаліся пытанні.

— Выдатна,—усміхаючыся, гаворыць Уладзімір Конан.

Поспех яго не выпадковы. Уладзімір—адзін з лепшых студэнтау курса. Ужо не першую сесію ён здае толькі на «выдатна».

Добра падрыхтаваліся і паказалі выдатныя веды С. Малевіч, Э. Маковіч, М. Рэзнік, В. Пятрушына, А. Спіткоуская, П. Прахаровіч.

Аднак ніжэй сваіх магчымасцей здалі экзамен В. Кабішчар, В. Аляхновіч, Вайтовіч. Яны атрымалі «добра».

Поспех усяго калектыву у значнай ступені залежыць ад поспеху кожнага студэнта. Гэта ярка выявілася на экзамене па асновах марксізма-ленінізма на II курсе гістфака.

**В. ПРЫБАВА,**
**Н. КАВАЛЁВА.**

*Фельетон*

# Запіскі аб адным „клубе"

У інтэрнаце па вуліцы Свердлава на дзвярах пакоя № 43, дзе жывуць студэнткі гістарычнага факультэта Кар'янава, Аўраменка, Стоцкая і Ватковіч, красуецца афішка, напісаная вяззю: «Клуб общества «Долой скуку!».

— Цудоўна,—скажуць некаторыя студэнты,—нядрэнна, каб сум выкаранялі не толькі ў інтэрнатах, але наогул у сценах універсітэта, асабліва ў дні масавых мерапрыемстваў.

Сапраўды, справа як быццам-бы на першы погляд карысная. Але варта толькі пазнаёміцца з уставам «шаноўнага таварыства», які вісіць крыху ніжэй шыльды, каб пераканацца, што метады ўвесялення, прынятыя новаўленым клубам за аснову, не толькі не звычайныя, але проста дзікія. Не хочацца верыць, што падобны «дакумент» маглі скласці камсамолкі. Адзін з параграфаў шматразумных правіл кампаніі гаворыць: «Святая обязанность членов клуба—бороться с употреблением спиртных напитков посредством уничтожения оных».

— Гэта жарцік,—гудуць вам на вуха чатыры спіўшыяся галасы.— Нічога падобнага няма. Мы не п'ем, не курым, а толькі круцім пласцінкі ды зрэдку па начах лазім у інтэрнат праз акно.

Але калі вы рызыкнеце ўсумніцца ў паказаннях аднаклубніц і паспрабуеце супаставіць факты, то хутка даведаецеся, што «устаў» зусім ужо не такі нявінны жарт і ўстаўныя правілы выконваюцца руплівымі членамі вельмі добрасумленна.

Так, вы будзеце ведаць, напрыклад, што Кар'янава не толькі любіць круціць пласцінкі, але і сама ў п'яным выглядзе не супраць пакруціцца ў гразі і лужах, каб набыць не сумны відзік. Тая-ж Кар'янава, напіўшыся, скандаліць у калідорах, б'е пасуду, ломіцца ў дзверы суседніх пакояў, зусім не лічачыся з правіламі агульнажыцця. Ды з кім лічыцца Кар'янавай? З нейкімі «манашкамі» (так кампанія велічае сваіх суседак), якія нічога не разумеюць у «жыцці з раскрутачкай»? Але «жыццё з раскрутачкай» не азначае толькі адно беспрабуднае п'янства. Справа ў тым, што «членами весёлого клуба могут быть все лица мужского и женского пола, аккуратно платящие членские взносы и принадлежащие ему душой и телом». А тэмпераментныя мужчыны высокароднага зборышча маюць звычку заканчваць пасяджэнні «клуба» грандыёзнымі бойкамі. У памяці жыхароў інтэрната яшчэ свежыя ўспаміны аб вялікім пабоішчы ў першамайскія дні, калі з-за лятаючых талерак не бачна было сонца, а бутэлькі з-пад гарэлкі хмарамі насіліся пад столлю славутага пакою.

Ганаровым членам праўлення «таварыства» з'яўляецца студэнт Скарабагаты. Ён жанаты і мае двое дзяцей, аднак любіць выкарыстаць шырокія правы, прадастаўляемыя «уставам» членам арганізацыі. У адным з хітрых параграфаў яго значыцца: «Члены клуба принадлежат друг другу душой и телом». Падабаецца гэты пункцік і замужняй Стоцкай. Але адкуль ведаць аб існаванні гэтага правіла іх суседзям? Так, адна дзяўчына па гаспадарчых справах у даволі ранні час, у сем гадзін раніцы, зайшла ў пакой 43 і страшэнна здзівілася: на ложках яна ўбачыла значна большую колькасць галоў, чым прадугледжвалася адміністрацыяй, якая паставіла тут ложкі ўсяго на чатыры персоны. На наступны дзень студэнтку папярэдзілі: калі яна ўздумае не забыць тое, што бачыла раніцай, то будзе мець справу з лепшымі баксёрамі горада.

Вясёлыя члены вясёлага клуба вельмі нявесела адчуваюць сябе на экзаменах. Няспынныя начныя п'янкі і бойкі, безумоўна, уплываюць на здароў'е: раніцай звычайна ўся кампанія скардзіцца на галаўную боль, п'е расол і не ходзіць на заняткі.

Дзяржаўны экзамен па асновах марксізма-ленінізма ўвесь клуб з вялікай цяжкасцю здаў на «здавальняюча». Затое пасля экзамену яны далі «заявачку», як гаворыць Кар'янава. Трэба думаць, што пасля такой «заявачкі» наступны экзамен не пойдзе ў іх лепш.

Усё «аб'еднанне» зусім не падрыхтавана да той работы, якая іх чакае. Што з Кар'янавай за дырэктар Дома культуры, калі яе асабістыя культурныя запросы абмяжоўваюцца буфетам з гарэлкай і закускамі ды танцулькамі з алкаголікамі? Пасля паднісання назначэння на работу аднаклубніцы зусім расперазаліся.

— Нам цяпер напляваць на ўсе вымовы,—заяўляе студэнтка Ватковіч.

Мяркуем, што камсамольская арганізацыя гістарычнага факультэта праявіць апяратыўнасць і, нягледзячы на тое, што да канца вучэбнага года засталося 15 дзён, зоймецца справай «кампаніі». Не патрэбна Ватковіч і другім выносіць вымовы. Ясна, што вясёлым «раскрутчыкам» даўно не месца ў камсамоле, ды і, наогул, трэба падумаць, ці можна даверыць ім выхоўваць падрастаючае маладое пакаленне.

**А. ПЯТРОЎ.**

# У будучых журналістаў

Экзамен па беларускай літаратуры ў студэнтаў III курса аддз. журналістыкі ў асноўным прайшоў паспяхова. Большасць студэнтаў паказалі досыць грунтоўныя веды. Яны прадэманстравалі добрае веданне літаратурных фактаў, паказалі сваё ўменне разбірацца ў пытаннях тэорыі і спецыфікі мастацкіх твораў. Заслужана атрымалі выдатныя адзнакі Паўловіч, Пільшчыкаў, Хлебавец, Мазанік, Нікалаенка, Васілеўскі і іншыя.

Але трэба сказаць, што будучыя журналісты маглі-б значна лепш ведаць літаратуру. Многія з іх абмежаваліся тым, што толькі з большага прачыталі тэксты і спадзяваліся на веданне зместу. Былі і такія студэнты, якія прыйшлі на экзамен зусім непадрыхтаванымі. Студэнтка Вашурына, напрыклад, не змагла назваць ніводнай паэмы Якуба Коласа, нічога не расказала пра метад сацыялістычнага рэалізма.

**Я. ІВАНОЎ.**

# „ВЫДАТНА!"

На II курсе філфака ідзе экзамен па асновах марксізма-ленінізма. Каля дзвярэй, як заўсёды, шум і спрэчкі.

— Ты хвалюешся? — пытаецца белакурая дзяўчына ў высокага хлопца, які стараецца запомніць усе лічбы, што ёсць у справаздачным дакладзе Н. С. Хрушчова XX з'езду КПСС. Ён шэпча іх нараспеў, нікога не прыкмячаючы. Толькі тады, калі дзяўчына тузае яго за рукаў, ён аглядваецца.

— Хвалююся? Не, што ты.

— А я хвалююся,—прызнаецца дзяўчына.

У гэты час адчыніліся дзверы.

— Ну што?—усе азірнуліся.

— Выдатна!

Зноў шум віншаванняў і вясёлыя воклічы.

— Як здаюць другакурснікі?— пацікавіліся мы.

— Студэнты ў асноўным да экзамену падрыхтаваліся добра,— гаворыць экзаменатар.—Толькі некаторыя не могуць адказаць на пытанні бягучай палітыкі.

Але асноўная маса студэнтаў адказвае чотка, ясна. Вельмі добра адказвалі Мішурная, Пігулеўская, Кірылава і іншыя.

... З аўдыторыі выйшаў Клімаў. Хлопец усміхаўся, і ніхто не адважыўся спытаць, што ён атрымаў.

— Безумоўна, «выдатна»;—сказаў нехта і дабавіў:—Ужо 11 «выдатна!»

**Ф. БАРЫСАЎ.**

# ЭКЗАМЕНЫ СКОНЧЫЛІСЯ —НА ПРАКТЫКУ

На II курсе юрыдычнага факультэта закончылася летняя экзаменацыйная сесія, пачалася вытворчая практыка ў гарадах і раёнах рэспублікі.

Многія студэнты курса добрасумленна адносіліся да заняткаў у працэсе навучальнага года, не трацілі дарагіх мінут у падрыхтоўчы перыяд і здалі сесію толькі на «добра» і «выдатна». Хочацца адзначыць асабліва такіх таварышаў, як Барыс Серафімовіч, Васіль Алёхін, Васіль Левы, Юрый Паршын, Нарановіч і іншыя. Усяго сесію на «выдатна» здалі 11 чалавек, на «добра» і «выдатна»— 68 чалавек, 12 чалавек атрымалі «здавальняючыя» і «нездавальняючыя» адзнакі.

Студэнт Н. Рудзін атрымаў дзве двойкі. Гэта гаворыць аб тым, што ён несур'ёзна адносіўся да заняткаў на працягу навучальнага года і ў падрыхтоўчы перыяд, а Дзямянцей дазволіў сабе не з'явіцца на экзамен па спецпадрыхтоўцы.

На практыцы студэнты II курса юрфака павінны атрымаць добрае ўяўленне аб рабоце суда і пракуратуры.

**А. САДОЎСКІ.**

# Душа калектыву

Вялікай павагай карыстаецца сярод студэнтаў БДУ І. Я. Кліёнскі, кіраўнік універсітэцкага харавога калектыву. Хто не ведае гэтага простага і чулага чалавека, педагога і сябра! Любоў да сваёй справы, жаданне бачыць узначальваемы калектыў перадавым—такія рысы характарызуюць І. Я. Кліёнскага як кіраўніка.

Музычную адукацыю ён атрымаў спачатку ў Мінскім музычным вучылішчы, а затым, пасля вайны, удзельнікам якой ён быў, закончыў Ленінградскую кансерваторыю.

У 1950 г. І. Я. Кліёнскі быў запрошаны ў наш універсітэт кіраваць хорам. Іменна з яго прыходу і пачынаецца біяграфія хора.

Упорная праца, добрасумленныя адносіны да сваёй работы далі добрыя вынікі. Пад кіраўніцтвам І. Я. Кліёнскага наш харавы калектыў увайшоў у лік лепшых хораў рэспублікі. На рэспубліканскіх аглядах ён неаднаразова займаў першыя месцы. Праўда, у хора былі і няўдачы, але яго кіраўнік заўсёды ўмеў падтрымаць дух калектыву, умеў арганізаваць работу з ім.

Цяпер калектыў рыхтуецца да універсітэцкага фестывалю, які намечана правесці ў верасні месяцы. У рэпертуары хора—рускія і беларускія народныя песні, творы савецкіх і беларускіх кампазітараў.

У новым навучальным годзе І. Я. Кліёнскі намеціў развучыць новую праграму выступленняў— цыкл песень краін народнай дэмакратыі, у які ўвойдуць польскія, балгарскія песні.



Побач з гэтым цыклам рэпертуар хора папоўніцца новымі беларускімі народнымі песнямі. Самым вялікім жаданнем І. Я. Кліёнскага з'яўляецца вывучэнне музычнай граматы з удзельнікамі хора, таму што без яе далейшы рух наперад немагчымы.

**В. ДУШКЕВІЧ.**

# ЗАГЛЯНІЦЕ Ў ІНТЭРНАТ!

Весела ў гэтыя чэрвеньскія ночы ў інтэрнаце па вуліцы Свердлава, 34. Чаго тут толькі не пачуеш, чаго не ўбачыш! На кожным паверсе свая музыка, свае мелодыі і рулады. Нездарма гавораць, што вясна абуджае эмоцыі і пачуцці. Калі хто хоча патанцаваць, прыходзьце ў наш інтэрнат. Тут танцы бываюць да самай раніцы. Пра тое, што ў вас экзамен, можна забыць. Ды і чаго не забудзеш, калі круцішся да стомы ў імклівым вальсе...

Такое вясёлае жыццё наступіла ў нас таму, што дзяжурны па інтэрнату—«свой чалавек». Дзяжурны Арцішчук і выпіць можа, і пагуляць любіць, наогул, ён—кампанейскі хлопец. Пастаўце яму хто-небудзь са студэнтаў-геолагаў чарку гарэлкі, дык ён не то што танцы, а нават алімпіяду дазволіць праводзіць ноччу ў інтэрнаце. І не дзіўна: Арцішчук сам збіраецца стаць студэнтам, бо яму падабаецца вясёлае, «бесклапотнае» жыццё. Летась паступаў ён ва універсітэт, ды «праваліўся» на экзаменах. А сёлета зноў збіраецца паступаць, тым больш, што аднаю нагой ён ужо стаіць ва універсітэце: мае пасаду дзяжурнага і месца ў інтэрнаце. Засталася нейкая там дробязь—здаць уступныя экзамены...

Калі вы захочаце прыйсці ў інтэрнат, то не забудзьце, што рабіць гэта трэба асцярожна. Паспрабаваў-жа зайсці да сваіх знаёмых студэнт III курса беларускага аддзялення, дык ледзь жывым вырваўся. Справа ў тым, што ў Арцішчука ёсць свая каманда, якая горача падтрымлівае ўсе яго «карысныя» пачынанні. У гэтую каманду ўваходзіць, напрыклад, студэнт II курса аддз. геалогіі Карашкоў. Ён, праўда, не жыве ў інтэрнаце, але ў яго жалезныя кулакі, і па гэтай прычыне ён за атамана ў камандзе Арцішчука. Днямі разбіў Карашкоў да крыві твар студэнту-выпускніку Лазоўскаму... і нічога. Другога-б да адказнасці прыцягнулі, а яму хоць-бы што.

Вы ўсё-ж прыходзьце ў інтэрнат, магчыма, вас і не паб'юць. На рэшце, не кожнага-ж тут б'юць. Добра было-б, каб у інтэрнат заглянулі выкладчыкі геалагічнага аддзялення на чале з дэканам. Яны-б убачылі шмат цікавага, пераканаліся-б, чаго варты хоць-бы той самы Карашкоў...

**Мікіта ВЯСЁЛЫ.**

# У ПАГОНІ ЗА СЕНСАЦЫЯЙ

У сатырычным прыдатку да насценгазеты «Слова філолага» ад 24 мая 1956 г. змешчана карыкатура на студэнта II курса аддз. журналістыкі Э. Дамарацкага. Пад карыкатурай подпіс: «Так вёў сябе на заліку па зарубежнай літаратуры Э. Дамарацкі». Газета сцвярджае, што Дамарацкі пагражаў выкладчыку, а той, напалохаўшыся, паставіў яму залік.

Пагнаўшыся за сенсацыяй, газета (рэдактар В. А. Захарава), не праверыўшы фактаў, рашыла раскрытыкаваць Дамарацкага.

— Ты што, Эдзік, у мінулым годзе хацеў Наума Ісакавіча збіць?—са здзіўленнем пытаюцца ў Дамарацкага студэнты, якія здавалі залік у той-жа дзень і ведаюць, як было ўсё на самай справе. Здзіўляюцца і выкладчыкі зарубежнай літаратуры Н. І. Лапідус і Д. Е. Фактаровіч, якія прымалі залік.

А Дамарацкі ходзіць да начальства і просіць, каб разабраліся, у чым справа. Ці не лёгкавесна пасля гэтага «Слова філолага»?

Прычынай паяўлення такіх матэрыялаў з'яўляецца тое, што многае ў «Слове філолага» робіцца без ведама рэдкалегіі. Так атрымалася і ў апошнім нумары. Загадчык аддзела сатыры і гумару Г. Барадулін нават і не ведаў, як быў выпушчан апошні сатырычны прыдатак «Будзьце знаёмы».

Мы, студэнты II курса аддз. журналістыкі, хацелі-б пажадаць рэдакцыі ў будучым больш уважліва адносіцца да сваёй справы.

**П. БЕРАЖКОЎ, А. СПІРЫДОНАЎ, А. СТАНЮТА, В. СКАПА, В. ЗУЁНАК, С. ЛЯПЕСІН, В. ЛУКІН.**

---

аб рабоце ў другім семестры. Аднак вось ужо канчаецца навучальны год, а партбюро так і не праверыла дзейнасць свайго рашэння. І невыпадкова конкурсная камісія па агляду насценных газет універсітэта адзначыла, што газета біялагічнага факультэта не змагаецца за дзейснасць змяшчаемых матэрыялаў, часта застаецца рэгістратарам фактаў і падзей.

Для паляпшэння работы партарганізацыі ў цэлым вялікае значэнне мае і пытанне падрыхтоўкі самога рашэння, вядзення партыйнай дакументацыі. Усякае рашэнне павінна быць глыбока прадумана, у ім канкрэтна павінны знайсці адлюстраванне намячаемыя мерапрыемствы. Трэба не забываць, што прыняць канкрэтнае рашэнне—гэта значыць канкрэтна кіраваць; лягчэй-жа выканаць тое рашэнне, у якім чотка і зразумела ўказаны пастаўленыя задачы.

Партбюро біяфака пагарджае гэтымі элементарнымі патрабаваннямі. Прынятыя ім рашэнні крайне павярхоўныя па свайму зместу, у іх адсутнічаюць канкрэтныя мерапрыемствы, неабходныя для ўхілення тых або іншых недахопаў. Для прыкладу возьмем тое-ж пасяджэнне партбюро ад 8 снежня 1955 г. Побач з рашэннем па пытанню аб рабоце насценнай газеты (якое таксама павярхоўнае і неканкрэтнае) партбюро заслухала і справаздачу аб рабоце камсамольскага бюро IV курса. Адзначыўшы рад недахопаў у рабоце камсамольскай арганізацыі, партбюро запісала ў сваім рашэнні некалькі агульных палажэнняў. Паўстае пытанне: каму трэба такое рашэнне, якую карысць яно прынясе ў рабоце? Чым-жа павінны кіравацца камсамольцы ў рабоце? Ніводнай канкрэтнай прапановы, ніводнага мерапрыемства па аказанню дапамогі камсамольцам. Гэта не рашэнне, гэта проста адпіска. Можна з упэўненасцю сказаць, што яно рыхтавалася на хаду. Між тым, прыведзены прыклад не выключэнне, гэта характэрна для многіх рашэнняў партбюро біяфака. Трэба зрабіць сур'ёзны папрок партбюро і за афармленне дакументацыі. Дастаткова сказаць, што пастанова справаздачна-выбарнага партыйнага сходу на дзень праверкі знаходзілася ў сваім першапачатковым чарнавым накідy. Усе гэтыя недахопы адзначаны ў рашэнні партыйнага камітэта.

Няма патрэбы прыводзіць больш прыкладаў. І без таго зразумела, што ў рабоце партбюро біялага-глебавага факультэта маецца рад сур'ёзных недахопаў. Ухіліць іх—абавязак партбюро.

**П. СІЛІВАНЧЫК.**

# СВЯТА СТУДЭНЦКАЙ ПЕСНІ

6 чэрвеня у г. Тарту адкрываецца свята студэнцкай песні і танцау Прыбалтыйскіх рэспублік, у якім па запрашэнню оргкамітэта прымуць удзел мастацкія калектывы універсітэтау Масквы, Ленінграда, Кіева і Мінска.

Самадзейнасць БДУ імя В. І. Леніна будзе прадстаулена харавым, аркестровым і танцавальным калектывамі—усяго 120 чалавек.

Паездка у Тарту—справа ганаровая і вельмі адказная. Мастацкі калектыу універсітэта з'явіцца не толькі прадстауніком беларускага студэнцтва, але і паказчыкам культурнай работы, што вядзецца у сценах нашай ВНУ. Свята студэнцкай песні і танцау—падрыхтоучы этап да фестывалю моладзі, які адбудзецца у Маскве.

Мастацкая самадзейнасць універсітэта рыхтуе вялікую праграму выступлення. Акрамя беларускіх народных песень і танцау, у яе уключаны песні совецкіх і беларускіх кампазітарау. У зводным хоры будуць выкананы старадауні студэнцкі гімн «Гаудэамус» на лацінскай мове, эстонская песня «Мая краіна», «Марш моладзі» і песня В. Мурадэлі «Слухаи нас, усёй зямлі моладзь». Аркестр народных інструментау, акрамя суправаджэння хора і танцавальнага калектыву, выступіць з творамі Будашкіна, Андрэева і Чуркіна.

Танцавальная група падрыхтуе «Рускую пляску» і беларускія народныя танцы «Польку» і «Лявоніху. «Лявоніха» будзе выконвацца у суправаджэнні хора і аркестра. Як і хор, танцавальны калектыу выступіць у складзе зводных калектывау, якія выканаюць эстонскі народны танец.

У час знаходжання у г. Тарту самадзейнасць БДУ выступіць таксама з канцэртамі перад працаунікамі эстонскай прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

Удзел у сваце яшчэ цясней звяжа вузамі дружбы студэнтау брацкіх саюзных рэспублік і бліжэй пазнаёміць удзельнікау з народным мастацтвам Прыбалтыкі і Беларусі.

Наша задача—падтрымаць гонар свайго універсітэта.

**П. СІДОРКІН.**

*НАШ КАЛЯНДАР*

# ГІМН ПЕРАДАВОГА ЧАЛАВЕЦТВА

***(Да 85-годдзя з дня напісання „Інтэрнацыянала")***

Ёсць рэчы, для якіх не існуюць ні нацыянальныя прыкметы, ні межы, ні рознасць мовы, звычаяу: яны аднолькава дарагія і зразумелыя для кожнага чалавека на зямлі. Такім агульначалавечым сімвалам стау міжнародны пралетарскі гімн «Інтэрнацыянал», словы і мелодыю якога аднолькава добра ведаюць у Кітаі і Англіі, на Новай Зеландыі і у Бразіліі, на якім-небудзь невялічкім, закінутым сярод акіянскіх хваль астрауку, і у горадзе небаскробау у Злучаных Штатах Амерыкі.

85 год таму назад, 3 чэрвеня 1871 года, у агні Парыжскай камуны нарадзіуся верш, які стау пазней міжнародным пралетарскім гімнам. Аутарам яго быу французскі паэт Эжэн Поцье. Удзельнік лютаускай рэвалюцыі і чэрвеньскага паустання 1848 года Эжэн Поцье быу актыуным дзеячом рабочага руху 60-х гадоу і першага Інтэрнацыянала. Ён быу выбран членам Парыжскай камуны і удзельнічау ва усіх яе мерапрыемствах. Усё сваё жыццё паэт прысвяціу справе рэвалюцыі. Эжэн Поцье змагауся за яе са зброяй у руках, на барыкадах. Але яшчэ больш грознай зброяй для ворагау былі яго песні. Яшчэ у 14 год ён напісау сваю першую песню «Няхай жыве свабода». І сапрауднай вяршыняй творчасці рэвалюцыйнага паэта стау «Інтэрнацыянал».

«Інтэрнацыянал», глыбока насычаны рэвалюцыйным пафасам, садзейнічау распаусюджанню ідэй камуны па усяму свету і стау міжнародным пралетарскім гімнам, гімнам Комуністычнай партыі Совецкага Саюза і комуністычных партый іншых краін. У 1888 годзе П'ер Дэгейтэр паклау тэкст «Інтэрнацыянала» на музыку. Упершыню «Інтэрнацыянал» быу выканан у чэрвені 1888 года на рабочым сваце у горадзе Лілі.

Прайшло нямнога часу, і «Інтэрнацыянал» стау гімнам пралетарыяу усяго свету. Ні адна песня, ні адзін гімн у гісторыі чалавецтва не атрымау такога шырокага распаусюджання сярод народных мас, як «Інтэрнацыянал». У 1917 годзе «Правда» пісала: «Такое-ж значэнне, як Чырвоны сцяг, мае песня «Інтэрнацыянал»... Яе спяваюць еурапейскія рабочыя, павінны спяваць і мы пры усіх пралетарскіх выступленнях. Матыу песні—родны матыу для рабочых усіх краін...»

У Расіі «Інтэрнацыянал», нягледзячы на усе забароны царскага урада, пачау распаусюджвацца у пачатку XX стагоддзя. Аднак упершыню на рускай мове ён быу надрукаван у часопісе, які выдавауся за мяжой. Ворагі рэвалюцыі ведалі, якая велізарная сіла тоіцца у гэтай песні, поунай высокага рэвалюцыйнага пафасу, ідэйнай мэтанакіраванасці. І яны усімі сіламі стараліся перашкодзіць распаусюджанню гэтага гімна. За спяванне «Інтэрнацыянала» падвяргалі жорсткім праследаванням, у многіх краінах «Інтэрнацыянал» забаронен.

Аднак няма такой сілы, якая-б магла перашкодзіць распаусюджанню гімна. Кожны прыгнечаны чалавек, кожны, хто гне сваю спіну на эксплуататарау, з каго выціскаюць апошнія сокі дзеля нажывы, дзеля багацця, узнімаючы свой голас супраць прыгнятальнікау, разам са зброяй, як сцяг, як сімвал, паднімае гімн «Інтэрнацыянал».

Прарочыя словы песні «Мы наш, мы новы свет збудуем, хто быу нічым, той стане усім»—знайшлі ажыццяуленне у нашай краіне. Рускі пралетарыят, скінуушы прыгнёт капіталістау і памешчыкау у 1917 годзе, пабудавау свой новы свет. «Інтэрнацыянал» быу і застаецца сцягам у барацьбе за свабоду для працоуных тых краін, якія яшчэ жывуць пад капіталістычным прыгнётам. Гэты гімн згуртоувае і паднімае рабочы клас, працоуных усяго свету на барацьбу з сіламі рэакцыі, імперыялізма, на барацьбу за соцыяльнае вызваленне, за ідэі комунізма.

**Рэдакцыі газеты «Беларускі універсітэт»**

Ад імя праулення і калгаснікау калгаса «Перамога» Дзержынскага раёна Мінскай вобласці просім перадаць праз газету удзячнасць калектыву мастацкай самадзейнасці Беларускага дзяржаунага універсітэта імя В. І. Леніна за цікавы канцэрт мастацкай самадзейнасці.

**Старшыня калгаса «Перамога» БОКАЧ.**

# ЯНЫ СТАЛІ ПЕРШАРАЗРАДНІКАМІ

Калі членам лыжнай секцыі даваліся заданні на зімовы сезон, Яугенію Ногатаву даручана было выканаць нарматыу першага разраду. Многія думалі, ці не вельмі многа гэта для Ногатава? Ён-жа усяго другі год займаецца у секцыі.



Але першыя трэніроукі паказалі, што юнак можа паспяхова справіцца з даручэннем. Сістэматычна, па пяць разоу у тыдзень, Яугеній займауся у секцыі. Заняткамі кіравау вопытны трэнер В. В. Нікіцін. Падрабязна разглядаліся малейшыя памылкі у тэхніцы хадзьбы. Многа давялося папрацаваць над тактыкай лыжніка-гоншчыка. У самым разгары зімовага сезону Яугенія ад запаветнай мары аддзяляла адна мінута. Патрабаваліся месяцы настойлівай працы. І вось на першынстве універсітэта запаветны рубеж быу пераузыйдзен: Яугеній Ногатау паказау вынік вышэй першага разраду.

Уперадзе—тры гады вучобы ва універсітэце, новыя перамогі на лыжні.

* * *



Кожны спартсмен выбірае для сябе любімы від спорту. Адны аддаюць перавагу лёгкай атлетыцы, другія—гімнастыцы, трэція—валейболу, баскетболу або футболу, а Уладзімір Дашкевіч больш за усё захапляецца гульнёй у шашкі, якую ён любіць са школьных гадоу. Яму давялося займацца у шашачнай секцыі пры Мінскім Палацы піянерау, дзе кіраунікамі былі вопытныя беларускія шашысты. Тут-жа у 1954 г. Уладзімір атрымау трэці, а хутка і другі разрады. Праз год ён паступіу на I курс фізіка-матэматычнага факультэта. У лютым гэтага года у гарадскім шахматна-шашачным клубе было разыграна юнацкае першынство г. Мінска па шашках. Уладзімір набрау 10,5 ачка з 15 магчымых і заняу чацвертае месца. У гэтым турніры ён выканау норму першага разраду.




# Насустрач студэнцкай спартакіядзе

Гэтым летам спартсмены нашага універсітэта будуць удзельнічаць у многіх спаборніцтвах. Асабліва цікавай падзеяй у спартыуным жыцці нашых студэнтау, безумоуна, з'явіцца Усесаюзная студэнцкая спартакіяда. Нашаму універсітэту выпала вялікая і разам з тым адказная задача—абараніць спартыуны гонар беларускага студэнцтва на гэтай спартакіядзе.

Спартакіяда пачнецца 22 жніуня у Днепрапятроуску. У ёй прымуць удзел спартыуныя калектывы 30 буйнейшых ВНУ краіны. Трэба адзначыць, што спаборніцтвы будуць вельмі сур'ёзныя і адказныя. Аб гэтым сведчыць хаця-б тое, што залікі на спаборніцтвах будуць праводзіцца па нормах не ніжэй другога спартыунага разраду. У спартакіядзе прымуць удзел спартсмены такіх ВНУ краіны, шырока вядомых сваімі спартыунымі дасягненнямі, як МГУ імя Ламаносава, Маскоускага педагагічнага інстытута, у якім ёсць факультэт фізічнай культуры Вышэйшага тэхнічнага вучылішча імя Баумана, Тбіліскага і Львоускага політэхнічных інстытутау і інш. Такім чынам, гэтыя спаборніцтвы з'явяцца даволі суровай праверкай для спартсменау нашага універсітэта.

На спартакіядзе студэнты будуць спаборнічаць па трох відах спорту: лёгкай атлетыцы, плаванню і гімнастыцы. Каманда нашага універсітэта складаецца з 21 лёгкаатлета, 11 плаунцоу і 8 гімнастау. Трэба адзначыць, што залік для гімнастау будзе праводзіцца па нормах першага разраду.

Кафедра фізічнага выхавання універсітэта разгарнула падрыхтоуку да спартакіяды. Ужо складзены спісы зборных каманд. Нядауна на кафедры адбыуся сход членау зборных каманд па лёгкай атлетыцы, плаванню і гімнастыцы. Цяпер спартсмены узмоцнена трэніруюцца пад кіраунiцтвам вопытных трэнерау. Так, напрыклад, лёгкаатлеты трэніруюцца пад кіраунiцтвам майстра спорту В. Г. Кушнарова. Трэніроукі лёгкаатлетау праходзяць на рэспубліканскім стадыёне «Дынама». У склад зборнай каманды па лёгкай атлетыцы уваходзяць такія спартсмены, як Ціток, Гулякевіч (бег на кароткія дыстанцыі), Кліцуноу, Сацункевіч (бег на сярэднія дыстанцыі), Пpановіч (спартыуная хадзьба), Чамярыцкі (ядро), Станішэускі (скачкі) і інш. Спартыуны гонар універсітэта па гімнастыцы будуць абараняць такія моцныя першаразрадніцы, як Шэкава, Патаповіч.

Кафедра фізічнага выхавання прымае меры для закупкі спартыунага інвентару і формы. З 15 ліпеня усе члены зборных каманд будуць праходзіць вучэбна-трэніровачныя зборы у спартыуным лагеры у Стайках. Гэта дапаможа спартсменам добра падрыхтавацца да спартакіяды.

З усяго гэтага відаць, што нашым спартсменам ствараюцца усе умовы для найлепшай падрыхтоукі да прадстаячых спартыуных баёу.

Абавязак кожнага спартсмена універсітэта—рэгулярныя і настойлівыя трэніроукі. Вядома, што спартыуныя поспехі не прыходзяць самі. Для дасягнення іх патрабуецца настойлівая праца над сабой. Цяпер, калі ідуць экзамены, трэба асабліва уважліва і умела спалучаць заняткі спортам з паспяховай вучобай. Пры правільным размеркаванні часу спорт не толькі не перашкаджае паспяховай вучобе, а, наадварот, дапамагае ёй. Прыкладам можа паслужыць Уладзімір Ціток. Ён выдатнік вучобы і добры спартсмен—рэкардсмен універсітэта у бегу на 100 м.

Спартакіяда народау СССР, Усесаюзная спартакіяда студэнтау у Днепрапятроуску з'явяцца сапраудным святам сілы і маладосці совецкіх юнакоу і дзяучат.

Пажадаем-жа нашым спартсменам з поспехам здаць экзамены і добра падрыхтавацца да прадстаячых спаборніцтвау, каб на «выдатна» абараніць спартыуны гонар буйнейшай ВНУ БССР.

**В. МАЛІБОШКА.**

# *Лыжнікі трэніруюцца*

Весела свеціць сонейка. На дрэвах зелянее лісце. А на спартыунай пляцоуцы універсітэта трэніруецца... лыжная секцыя. Так, лыжная секцыя. Снег ужо дауно сышоу з палёу, а секцыя не распалася.

Вядома, якое вялікае значэнне адыгрывае у спаборніцтвах агульная фізічная падрыхтоука спартсмена. Для таго, каб прайсці добра на лыжах, напрыклад, 30 км, трэба, акрамя выдатнага валодання тэхнікай хадзьбы, быць і выдатна падрыхтаваным фізічна. Вось на гэта у асноуным і накіроуваюцца трэніроукі лыжнікау вясной і летам.

Першае, што кідаецца у вочы, калі глядзіш на лыжнікау у час трэніроукі секцыі —масавасць. Васіль Васільевіч Нікіцін здолеу зацікавіць лыжным спортам многіх студэнтау. Цяпер заняткі праходзяць прыблізна у такім плане: размінка—сюды уваходзяць розныя фізічныя практыкаванні, якія падрыхтоуваюць мышцы да напружанай работы; затым спартыуныя гульні, у прыватнасці, баскетбол—яны дапамагаюць выпрацоуваць скарасную вынослівасць, павышаюць працаздольнасць арганізма, і, нарэшце, заключная частка—павольны бег.

Асноуная маса секцыі—спартсмены-разраднікі. Е. Ногатау, А Караткевіч маюць першы спартыуны разрад. Многа ёсць другаразраднікау: А. Жыдовіч, І. Варабейчык, А. Кісялёва, Андрэеу.

Секцыя лыжнікау павінна служыць прыкладам добрасумленных адносін да заняткау спортам. Ёсць чаму павучыцца тут канькабежнай секцыі, якая пачынае сваю работу толькі тады, калі паяуляецца лёд, і канчае, як толькі ён растае. Вопыт гаворыць, што дабіцца поспехау можна толькі пры круглагадовай трэніроуцы, чаго, нажаль, няма у нашых канькабежцау.

Добрыя вынікі работы лыжнай секцыі сведчаць аб напружанай працы яе членау, аб тым, што толькі рэгулярныя круглагадовыя трэніроукі прыносяць спартыуны поспех.

**М. УЛАДЗІМІРАЎ.**


Рэдактар А. ВОЛК.


## А Б ' Я В А

**Да ведама навуковых работнікаў, аспірантаў, студэнтаў, служачых і рабочых універсітэта!**

**У адпаведнасці з загадам рэктара аб перавучоце кніжнага фонда бібліятэкі выдача адпускных грошай і летняй стыпендыі будзе адбывацца толькі пасля прадстаўлення даведкі аб здачы літаратуры ў бібліятэку.**

**Бухгалтэрыя.**


Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, пакой 62, тэл. 2-07-19

АТ 07485 Друкарня выдавецтва БДУ. Зак. 675 Тыраж 2000